VIII Звычайная нядзеля

Аўтар: кс. Юрый Бяганскі
26.02.2017 00:00

З Евангелля св. Мацвея

Езус сказаў сваім вучням: “Ніхто не можа служыць двум гаспадарам. Бо ці аднаго будзе ненавідзець, а другога любіць; ці аднаго будзе трымацца, а другім пагарджаць. Не можаце служыць Богу і мамоне.

Таму кажу вам: Не клапаціцеся аб жыцці вашым, што есці і што піць, ні аб целе вашым, у што апрануцца. Ці ж душа не большая за ежу, а цела – за вопратку? Паглядзіце на птушак нябесных: яны ні сеюць, ні жнуць, ні збіраюць у засекі, і Айцец ваш Нябесны корміць іх. Ці ж вы не нашмат лепшыя за іх? Ды і хто з вас, клапоцячыся, можа дадаць сабе росту хоць на адзін локаць? І пра вопратку навошта клапоціцеся? Паглядзіце на лілеі палявыя, як яны растуць: ні працуюць, ні прадуць. Але кажу вам, што і Саламон ва ўсёй славе сваёй не апранаўся так, як адна з іх. Калі ж палявую траву, якая сёння ёсць, а заўтра будзе кінута ў печ, Бог так апранае, наколькі ж больш вас, малаверныя! Таму не клапаціцеся і не кажыце: «Што нам есці?» – або: «Што піць?» – або: «У што апрануцца?». Бо ўсяго гэтага шукаюць язычнікі. Айцец жа ваш Нябесны ведае, што вы маеце патрэбу ва ўсім гэтым. Шукайце найперш Валадарства Божага і справядлівасці Ягонай, а гэта ўсё дадасца вам. Таму не клапаціцеся аб заўтрашнім дні, бо заўтра само за сябе паклапоціцца. Хопіць кожнаму дню свайго клопату”. †

Мц 6, 24–34

Пад штандарам Езуса

Вялікія гэтага свету маюць свае распазнавальныя знакі: родавыя гербы, геніялагічныя дрэвы і штандары. У медытацыях св. Ігнацыя Лаёлы гаворыцца пра 2 штандары – Езуса і д’ябла. Выбраць штандар Хрыста – значыць пайсці толькі і выключна за Ім. І гэта добрае рашэнне. Аднак зманы свету могуць паспрыяць таму, што чалавек пачынае вагацца і нават змяняе сваё меркаванне.

Ісці за Езусам можна як у сужэнстве, так і ў святарстве ці манаскім жыцці. Небяспека адыходу ад Бога існуе таксама ў абодвух станах жыцця – можна сустрэць нявернасць як у шлюбе, так і ў святарстве. Момант дабравольнага выбару, пад чыім сцягам хочам правесці сваё жыццё, для кожнага індывідуальны, яго цяжка акрэсліць. Такі момант можа здарыцца неаднаразова за час доўгай зямной вандроўкі.